Нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

09.04.2014

**Зварот Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства**

**« Аб падтрымцы Рэзалюцыі ААН аб тэрытарыяльнай цэласнасці Ўкраіны»**

Мы, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі шырокага спектру арганізацый грамадзянскай супольнасці, палітычных партый, прафсаюзаў, грамадскіх арганізацый і ініцыятыў, асуджаем афіцыйную пазіцыю Рэспублікі Беларусь на Генеральнай Асамблеі ААН 27 сакавіка 2014 г. і падтрымліваем рэзалюцыю аб тэрытарыяльнай цэласнасці Ўкраіны.

Мы лічым, што прагаласаваўшы супраць рэзалюцыі аб тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны, афіцыйная Беларусь:

- уступіла ў супярэчнасць з неаднаразова заяўленай ёю раней пазіцыяй падтрымкі тэрытарыяльнай цэласнасці Ўкраіны,
- прадэманстравала сваё грэбаванне міжнароднымі дамовамі,
- паказала сваю непавагу да ўкраінскай дзяржавы і народу,
- прызнала законным захоп адной дзяржавай тэрыторыі іншай.

Па нашым глыбокім перакананні, у сітуацыі, калі крытычна важна пазбегнуць развязвання вайны любымі (і ў першую чаргу дыпламатычнымі) сродкамі, Беларусь павінна асудзіць акт анэксіі Крыма Расіяй, і з пазіцый вяршэнства міжнародных пагадненняў, непрымання агрэсіі адной краіны супраць іншай, выступіць у ролі стрымліваючага боку. На жаль, гэтага не адбываецца, беларускія ўлады падтрымалі пазіцыю афіцыйнай Расіі, робячы беларускі народ закладнікам імперскіх амбіцый яе кіраўніцтва.

Акрамя гэтага, змясціўшы на сваёй тэрыторыі расейскія вайсковыя фармаванні і авіяцыю, беларускае кіраўніцтва ігнаруе меркаванне грамадзян нашай краіны, падвяргаючы іх патэнцыйнай ваеннай пагрозе, даючы Расіі плацдарм для ваеннай пагрозы Ўкраіне.

Мы лічым, такую пазіцыю не адпавядаючай інтарэсам беларускага народа, які прагне міру і законнасці.

У гэтых умовах мы хочам заклікаць міжнародную супольнасць прыслухацца да голасу беларускай грамадзянскай супольнасці, якая выказвае спадзяванні значнай часткі грамадзян нашай краіны.

У гэтай небяспечнай рысы мы заклікаем урад Беларусі перагледзець сваю пазіцыю і зрабіць канкрэтныя дзеянні для зніжэння ваеннай напружанасці, у прыватнасці, па вывадзе расейскіх вайсковых фармаваньняў, уключаючы авіяцыйныя, з тэрыторыі нашай краіны.

Мы выказваем сваю падтрымку Рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН аб тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны, падзяляючы асноўныя прынцыпы Статута ААН аб павазе суверэнітэту, адзінства і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы. Мы асуджаем дзеянні Расеі ва Ўкраіне, заклікаем яе да адводу войскаў ад тэрыторыі Ўкраіны і з Крымскай паўвыспы.

Мы настойваем на тым, каб рашэнні беларускага ўрада ў дачыненні да сяброўскага ўкраінскага народа прымаліся, зыходзячы з інтарэсаў нашых грамадзян, прынцыпаў міралюбнасці і добрасуседства.

Мы таксама падтрымліваем ацэнку сітуацыі і патрабаванні, прадстаўленыя Малдаўскай Нацыянальнай платформай Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства ў рамках «Грамадскай пазіцыі аб асуджэнні дзеянняў Расійскай Федэрацыі, звязаных з сілавым умяшальніцтвам, якія прывялі да фактычнай анэксіі Аўтаномнай Рэспублікі Крым - складовай часткі Ўкраіны і аб неабходных дзеяннях у дачыненні бяспекі Рэспублікі Малдова».

*Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (больш за 60 арганізацый)*